# Исторические материалы и знаменательные даты

# Historical materials and significant dates

## ЮРЫДЫЧНАМУ ФАКУЛЬТЭТУ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА – 100 ГАДОЎ

## ЮРИДИЧЕСКОМУ ФАКУЛЬТЕТУ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА – 100 ЛЕТ

## THE FACULTY OF LAW OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY CELEBRATES 100th ANNIVERSARY

Наша альма-матар, юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у кастрычніку 2025 г. святкуе юбілей – 100-годдзе з дня заснавання. Адзначаючы гэту дату, мы падводзім вынікі вялікага этапу ў развіцці беларускай юрыдычнай навукі і юрыдычнай адукацыі.

Гісторыя развіцця юрыдычнага факультэта неразрыўна звязана з гісторыяй станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Вытокі юрыдычнай навукі і адукацыі Беларусі знаходзяцца ў далёкай старажытнасці. Яны звязаны з адкрыццём на беларускіх землях у 1641 г. юрыдычнага факультэта ў Віленскай акадэміі, які пазней уваходзіў у склад Галоўнай школы ВКЛ (з 1773 г.), Галоўнай Віленскай школы (з 1796 г.), Віленскага ўніверсітэта (з 1803 г.).

Узнаўленне развіцця беларускай юрыдычнай навукі і адукацыі непасрэдна звязана з адкрыццём у 1921 г. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у які ўваходзілі пяць факультэтаў. На факультэце грамадскіх навук функцыянавала прававое аддзяленне. У 1925 г. БДУ выпусціў 130 юрыстаў. У гэтым жа годзе СНК БССР пастанавіў адкрыць ва ўніверсітэце факультэт права і гаспадаркі.

За векавы перыяд наша альма-матар прайшла вялікі шлях. Юрыдычная школа БДУ мела розныя назвы і арганізацыйна-прававыя формы дзейнасці: факультэт права і гаспадаркі (1925), факультэт савецкага будаўніцтва і права (1930), Інстытут савецкага будаўніцтва і права (1931), Беларускі дзяржаўны юрыдычны інстытут (1932), Мінскі юрыдычны інстытут (1938), юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1954). Аднак заўсёды асноўнымі напрамкамі дзейнасці юрыдычнай школы былі падрыхтоўка высокакваліфікаваных юрыстаў, выхаванне дастойных грамадзян нашай Айчыны.

Карпатлівая праца, навуковы і творчы пошук выкладчыкаў, паспяховая практычная дзейнасць дзясяткаў тысяч таленавітых выпускнікоў, слаўныя традыцыі, закладзеныя падчас існавання галоўнай юрыдычнай школы выдатнымі вучонымі, высокі ўзровень выкладання і перадавое навуковае мысленне – гэта характарыстыкі, уласцівыя юрыдычнаму факультэту БДУ.

Векавы юбілей дазваляе нам успомніць важныя вехі і старонкі гісторыі факультэта, але перш за ўсё людзей, якія яго стварылі, працавалі і вучыліся на факультэце ў розныя гады. Заснавальнікамі многіх навуковых юрыдычных школ былі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўнікі пакалення пераможцаў: прафесары А. А. Галаўко, І. І. Гарэлік, В. А. Дарогін, С. Р. Драбязка, А. В. Дулаў, І. М. Ігнаценка, С. В. Курылёў, А. Ц. Лейзераў, Я. А. Мацвіенка, Г. А. Павецьеў, І. С. Цішкевіч, В. Ф. Чыгір, В. А. Шкурко, В. М. Шпілёў, М. Р. Юркевіч, Я. А. Юхо. Актыўна развівалі юрыдычную адукацыю ва ўніверсітэце франтавікі-выкладчыкі: дацэнты С. П. Бякешка, М. М. Гапановіч, К. В. Кічыгіна, М. М. Меркушаў, Я. Ф. Плюта, Я. М. Тагуноў, В. С. Швяцоў і інш.

Навуковыя школы за стагоддзе выхавалі не адно пакаленне таленавітых юрыстаў, высокаадукаваных спецыялістаў, дастойных грамадзян нашай Айчыны. У іх і зараз закладваецца падмурак у падрыхтоўцы спецыялістаў для прававой сістэмы.

Вялікі ўнёсак у развіццё ўніверсітэцкай юрыдычнай адукацыі і навукі зрабілі прафесары А. М. Абрамовіч, С. А. Балашэнка, Н. Л. Бандарэнка, А. У. Баркоў, В. М. Бібіла, Ю. П. Броўка, Р. А. Васілевіч, В. М. Гадуноў, І. А. Грунтоў, А. Я. Гучок, Т. І. Доўнар, А. Ф. Доўгань, А. М. Здрок, В. С. Камянкоў, Н. А. Карповіч, Т. І. Макарава, І. І. Марціновіч, М. В. Мяшчанава, Ю. І. Новік, А. Л. Савянок, М. В. Сторажаў, В. М. Талочка, Я. І. Функ, У. М. Хоміч, А. Г. Цікавенка, В. Г. Ціхіня, М. П. Чудакоў, В. І. Чупрыс, В. Б. Шабанаў, І. С. Шахрай, А. І. Швед. Палітычную навуку актыўна развівалі прафесары Н. А. Антановіч, Л. Я. Землякоў, Г. А. Круглова, С. В. Рашэтнікаў.

Стратэгічная роля ў арганізацыі ўнутранай структуры і «зместу» юрыдычнага факультэта ў савецкі перыяд належыць яго кіраўнікам – дэканам факультэта грамадскіх навук У. М. Ігнатоўскаму, С. З. Кацэнбогену, М. В. Грэдзінгеру, першаму дэкану факультэта права і гаспадаркі С. Я. Вольфсану, дырэктару Беларускага дзяржаўнага юрыдычнага інстытута, а пазней Мінскага юрыдычнага інстытута А. Н. Юрашкевічу, М. Н. Цвяткову, А. М. Штэйнграду, І. С. Андрэйчыку, Г. А. Павецьеву, дэканам юрыдычнага факультэта Я. М. Семярыхіну, М. М. Меркушаву, В. А. Дарогіну, І. М. Ігнаценка, В. А. Шкурко, В. Ф. Чыгіру, В. Г. Ціхіні. Гісторыя паспяховага развіцця сучаснага юрыдычнага факультэта звязана з імёнамі дэканаў В. М. Гадунова, С. А. Балашэнка, Т. М. Міхалёвай.

У розныя гады на факультэце вучыліся і выкладалі першая ў Беларусі жанчына – доктар юрыдычных навук І. І. Марціновіч (прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы БССР, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь), першая жанчына – прарэктар БДУ В. І. Чупрыс (зараз намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь).

Вучоныя юрыдычнага факультэта прымалі самы непасрэдны актыўны ўдзел у распрацоўцы (у тым ліку кадыфікацыі) праектаў заканадаўчых актаў. У цэнтры іх увагі былі актуальныя праблемы тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, міжнароднага, канстытуцыйнага, адміністрацыйнага, фінансавага, грамадзянскага, сямейнага, працоўнага, экалагічнага, зямельнага, крымінальнага, працэсуальнага права і іншых яго галін. Варта адзначыць прадуктыўны ўдзел дактароў і кандыдатаў юрыдычных навук факультэта ў рабоце Канстытуцыйнай Камісіі Рэспублікі Беларусь у 2021–2022 гг., а таксама ўдзел у штогадовых мерапрыемствах па ўдасканаленні галіновага нацыянальнага заканадаўства.

Вучоныя-юрысты актыўна ўдзельнічаюць ва ўдасканаленні арганізацыі і дзейнасці дзяржаўнага апарату, распрацоўцы новых форм і сродкаў забеспячэння законнасці як неабходнай умовы фарміравання грамадзянскай супольнасці і сацыяльнай прававой дзяржавы. У якасці навуковых экспертаў выкладчыкі факультэта рэгулярна працуюць у складзе навуковакансультатыўных саветаў па вырашэнні прававых пытанняў самага球 рознага ўзроўню. Так, шэраг вучоных з галіновых прававых кафедр уключаны ў Прававы кансультатыўны савет пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і групу экспертаў у галіне права пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Большасць дактароў юрыдычных навук ва ўсіх дзеючых доктарскіх саветах па абароне дысертацый па юрыдычных навуках у рэспубліцы складаюць работнікі юрыдычнага факультэта БДУ. Вучоныя факультэта ўваходзяць у навукова-кансультатыўныя саветы пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь, Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь, Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь, іншых органах дзяржаўнай улады і кіравання. Яны з’яўляюцца членамі Вышэйшай кваліфікацыйнай калегіі суддзяў Рэспублікі Беларусь, вучонага савета Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, рэдкалегій і рэдсаветаў шматлікіх беларускіх і замежных юрыдычных навуковых і навукова-практычных часопісаў, навуковых зборнікаў.

Прадстаўнікі юрыдычнага факультэта ўсебакова даследуюць пытанні беларуска-расійскай інтэграцыі, суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і гарантый яго забеспячэння ў прававой, эканамічнай, сацыяльнай і іншых сферах. Актыўная прапаганда беларускай прававой сістэмы вядзецца навукоўцамі на ўзроўні пасяджэнняў навукова-кансультатыўных саветаў Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Эканамічнага Суда СНД, а таксама на ўзроўні міждзяржаўных і міжнародных рабочых груп (сустрэч, мерапрыемстваў) па падрыхтоўцы прававых актаў.

За векавую гісторыю юрыдычны факультэт выпусціў больш за 35 000 спецыялістаў. Сярод іх 84 заслужаныя юрысты (БССР, Рэспублікі Беларусь), 3 заслужаныя дзеячы навукі Рэспублікі Беларусь, 3 заслужаныя работнікі адукацыі Рэспублікі Беларусь, 5 членаўкарэспандэнтаў НАН Беларусі. Юрыдычны факультэт БДУ скончылі кіраўнікі вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і дзяржаўных устаноў Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі дыпламатычных місій і міжнародных арганізацый, вядомыя вучоныя-юрысты, грамадскія дзеячы, юрысты-практыкі, у ліку якіх Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь В. М. Герасімаў, Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П. П. Міклашэвіч, Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь В. А. Сукала, Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь І. А. Швед.

У юрыспрудэнцыі, дзяржаўнай службе і палітыцы ярка праявілі сябе Ю. Г. Амбразевіч, Н. У. Барысенка,

Д. Ю. Баскаў, Р. А. Васілевіч, А. А. Гаеў, А. Я. Гучок, В. Д. Іпатаў, В. С. Камянкоў, В. Л. Калінковіч, С. В. Кандрацьеў, А. У. Канюк, Н. А. Карповіч, Ю. В. Кобец, М. С. Маркаў, В. В. Міцкевіч, А. М. Мяцеліца, Г. П. Падразёнак, Н. У. Пяткевіч, А. А. Рахманаў, М. У. Рыжанкоў, С. М. Сівец, А. К. Стук, І. У. Тылец, Н. М. Філіпава, Я. І. Функ, В. І. Чупрыс, А. С. Шандаровіч, А. І. Швакаў і інш. Выпускнікамі нашага факультэта ганарыцца ўся юрыдычная супольнасць Беларусі і замежжа, кожны з іх мае заслужаны аўтарытэт у грамадстве.

Зараз на факультэце гістарычныя традыцыі класічнай юрыдычнай адукацыі спалучаюцца з інавацыйнымі падыходамі ў фундаментальных і прыкладных даследаваннях. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў юрыдычны факультэт актыўна ўдзельнічае ў выкананні дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў. На наступныя пяць гадоў (2026–2030 гг.) запланавана кіраўніцтва васьмю рэспубліканскімі праграмамі навуковых даследаванняў. Сярод новых напрамкаў, якія актыўна распрацоўваюцца навукоўцамі, інфармацыйнае і лічбавае, карпаратыўнае, медыцынскае, спартыўнае права, права ЕАЭС і ШАС, права інтэлектуальнай уласнасці.

На факультэце атрымліваюць агульную вышэйшую адукацыю каля 3000 навучэнцаў: 1500 студэнтаў дзённай формы навучання, 1100 студэнтаў завочнай формы навучання, 150 студэнтаў завочнай формы навучання, якія атрымліваюць другую і наступную вышэйшую адукацыю. Паглыбленую вышэйшую адукацыю атрымліваюць каля 50 магістрантаў, паглыбленую вышэйшую адукацыю на англійскай мове – 250 магістрантаў (навучэнцы замежных дзяржаў). Кандыдацкія і доктарскія дысертацыі рыхтуюць 90 суіскальнікаў, аспірантаў і дактарантаў.

На юрыдычным факультэце агульную вышэйшую адукацыю можна атрымаць па трох спецыяльнасцях і васьмі спецыялізацыях, а паглыбленую вышэйшую адукацыю ў магістратуры – па дзвюх спецыяльнасцях і сямі прафілізацыях. Для замежных грамадзян з навучаннем на англійскай мове даступны тры прафілізацыі.

У структуру факультэта ўваходзяць 12 кафедр, Цэнтр адукацыйных інавацый, аддзел «Юрыдычная клініка», навучальная лабараторыя крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз, крыміналістычны палігон, музей юрыдычнага факультэта. На факультэце функцыянуюць Міжнародны навукова-адукацыйны цэнтр медыяцыі, прымірэння і трацейскіх працэдур, Цэнтр дзяржаўна-прававой палітыкі і кіравання, Цэнтр устойлівага развіцця.

На факультэце працуюць больш за 250 выкладчыкаў, у тым ліку вядомыя юрысты-практыкі, 1 член-карэспандэнт НАН Беларусі, 23 дактары і 143 кандыдаты навук. На факультэце падтрымліваюцца цесныя сувязі з дзяржаўнымі органамі і ўстановамі, юрыдычнымі кансультацыямі, юрыдычнымі кампаніямі, навуковымі ўстановамі Беларусі, а таксама краін СНД і ЕАЭС. Юрыдычны факультэт БДУ – гэта флагман айчыннай юрыдычнай навукі і калыска юрыдычных ведаў, класічнай універсітэцкай юрыдычнай адукацыі.

Сапраўдны гонар юрыдычнага факультэта – адораныя студэнты, вопытныя выкладчыкі, лепшыя выпускнікі!

Хочацца выказаць шчырую ўдзячнасць усім, хто звязаны з факультэтам. Сваёй працай, рыхтуючы новае пакаленне юрыстаў, мы ствараем будучыню Беларусі, выхоўваем сапраўдных патрыётаў.

Віншую вас, дарагія сябры! Жадаю калектыву юрыдычнага факультэта БДУ і ўсім яго выпускнікам развіцця і плёну, новых творчых поспехаў і перамог, радасці адкрыццяў, натхнення, прафесійнага даўгалецця і ўдачы!

Са святам, родны факультэт! З юбілеем, юрфак!

***А. В. Шыдлоўскі***[1]

[1] *Андрэй Віктаравіч Шыдлоўскі* – кандыдат юрыдычных навук, дацэнт; дэкан юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.
*Андрей Викторович Шидловский* – кандидат юридических наук, доцент; декан юридического факультета Белорусского государственного университета.
*Andrey V. Shidlovsky*, PhD (law), docent; dean of the faculty of law, Belarusian State University.
E-mail: *shidlovsky@bsu.by*